**Дадатак 3**

***Эпіграфы да ўрокаў беларускай літаратуры па вывучэнні эпічных твораў у5 класе***

| №пп | Аўтар, твор | Эпіграфы |
|---|---|---|
| 1. | Бытавая казка «Разумная дачка» | • Думаць, што ён самы разумны, можа толькі самы дурны чалавек. (Янка Сіпакоў)<br>• Самы лёгкі тавар – розум. (Георгій Марчук) |
| 2. | Чарадзейная казка «Залаты птах» | • Ад лёсу не схаваешся, нідзе не дзенешся. (Барыс Сачанка)<br>• Лёс ніколі не спраміць шляхі. (Людміла Рублеўская) |
| 3. | Народная казка «Музыкі» | • Дружба мацней за каменныя сцены. (Прыказка)<br>• Прыяцеля пазнаеш у няшчасці. (Прыказка)<br>• Шукай сабе сябра ў бядзе. (Прыказка) |
| 4. | Фальклорная легенда «Нарач» | • Адзін прыйшоў<br>і след пакінуў,<br>Другі прыйшоў,<br>каб наслядзіць. (Сяргей Дзяргай)<br>• Сцеражыце ж годнасць чалавечую.<br>Як жыццё, яна ў нас адна. (Ларыса Геніюш) |
| 5. | Народная легенда «Пестунь» | • Якая справа, такая й слава. (Прыказка)<br>• Справа не ў нашых імёнах… Справа ў добрай справе. (Анатоль Вярцінскі) |
| 6. | Якуб Колас «Крыніца» | • На зло ліхім прыгодам<br>Крыніцы свежыя цякуць. (Якуб Колас)<br>• Вада і тая<br>Не ўсюды роўны нораў мае. (Якуб Колас) |
| 7. | Уладзімір Караткевіч «Нямоглы бацька» | • Усё знікае, праходзіць, як дым, Светлы ж след будзе вечна жывым. (Максім Багдановіч)<br>• Чалавека сляды ў стагоддзях не гінуць.<br>Гэта помні заўжды,<br>Перш чым след свой пакінуць. (Еўдакія Лось) |
| 8. | Андрэй Федарэнка «Падслуханая казка» | • Прырода мае нейкае сваё свядомае жыццё. (Якуб Колас)<br>• Прырода не адкрываецца чалавечаму розуму… Яна яго толькі заманьвае. (Святлана Алексіевіч) |
| 9. | Якуб Колас «Песня ляснога жаваранка» | Прырода – найцікавейшая кніга, якая разгорнута перад вачамі кожнага з нас. Чытаць |

| | | |
|---|---|---|
| | | гэту кнігу, умець адгадаць яе мілагучныя напісы – хіба ж гэта не ёсць шчасце? (Якуб Колас) |
| 10. | Якуб Колас «У старых дубах» | • Многа цікавага пачуе той, хто ўмее чытаць кнігу божай прыроды, божага свету, хто цяміць і разбірае іх мову. (Якуб Колас)<br>• І ў няшчасці, і ў радасці без дружбы чалавеку нельга. (Кузьма Чорны) |
| 11. | Міхась Лынькоў «Васількі» | • Вайна заўсёды боль нясе. (Пятрусь Броўка)<br>• Вайна – самае праклятае з усіх ліхаў, заведзеных жыццём на зямлі. (Васіль Быкаў)<br>• Адказнасць за мір, за жыццё, за шчасце на зямлі ляжыць на кожным сумленным чалавеку. (Максім Танк) |
| 12. | Анатоль Кудравец «Цітаўкі» | • Калі сумленна ты пражыў свой дзень, сумленным, дружа, будзе і твой вечар. (Анатоль Грачанікаў)<br>• Сумленне заўсёды на лаўцы падсудных. Само сябе садзіць, само сябе судзіць. (Анатоль Вярцінскі) |
| 13. | Генрых Далідовіч «Страта» | • А вось чуласць, чалавечнасць –<br>Ім дарога проста ў вечнасць –<br>Больш за ўсё нам даражэй. (Якуб Колас)<br>• Чалавечнасць, як вечнасць,<br>Твой бязмерны маштаб! (Пятрусь Макаль) |
| 14. | Максім Лужанін «Добры хлопец Дзік» | Дабро мы можам ацаніць самі, а зло часцей за ўсё ацэньваюць на нашым горкім вопыце другія. (Георгій Марчук) |
| 15. | Уладзімір Караткевіч «Былі ў мяне мядзведзі» | І ніхто няхай не забывае, што ён частка вялікай прыроды. (Якуб Колас) |
| 16. | Міхась Лынькоў. «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» | Сяброўскі дар – найдаражэйшы дар. (Аляксей Зарыцкі) |